решений.

История международной торговли – это одновременно и история развития, и совершенствования государственного регулирования. Во внешнеторговых отношениях сталкиваются экономические интересы различных социальных слоёв и групп населения, и государство неизбежно оказывается вовлечённым в этот конфликт интересов. Кроме того, в современных условиях национальная экономика становится всё более открытой, и государство должно учитывать в своей политике тесную взаимосвязь процессов, происходящих внутри экономики и в сфере внешнеэкономических связей.

Подводя итог вышеизложенному в проблеме выбора внешнеторговой политики государства, можно говорить, о том что, очевидно, должно быть найдено некое оптимальное равновесие между свободной торговлей и протекционизмом.

Литература

1. Медведев, В.А. Глобализация экономики: тенденции и противоречия / В.А.Медведев // Мировая экономика и международные отношения. – 2004. - № 2. – С. 3-10;
2. Пебро, М. Международные экономические, валютные и финансовые отношения / М.Пебро; общ. ред. Н.С. Бабинцевой. – М.: Издательская группа «Прогресс» – Универс, 1994. – 496 с;
3. Томас, В., Нэш, Дж. и др. Внешнеторговая политика: опыт реформ / В.Томас, Дж.Нэш и др. – М.: ИНФРА – М, 1996. – 384 с.

УДК 316.35(476.6)

## РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫХ, ЭКАЛАГІЧНЫХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ НА ГАРАДЗЕНШЧЫНЕ Ў 1989 Г. НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЕЙНАСЦІ ГА “ПАХОДНЯ”

**М.І.Таранда, В.В.Дуброўскі**
УА “Гроденскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г.Гродна, Рэспубліка Беларусь

Статья содержит информацию, основанную на воспоминаниях участника всех тех событий, которые происходили в Гродно в течение 1989 года. В хронологическом порядке представлены важнейшие мероприятия, проводимые творческой общественностью города, объединенной в клуб “Паходня”, направленные на изучение истории, культуры своего народа, их пропаганду и возрождение.

The article contains the information based on memoirs of the participant of all those events which occured in Grodno within 1989. In the chronological order the major actions spent by the creative public of city, incorporated in club are presented “Pahodnya”, the histories directed on studying, cultures of people, their propagation and revival.

1989 год можна лічыць чацвёртым годам распачататай пры Міхале Гарбачове ў савецкай краіне перабудовы, якая з’явілася



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

моцным стымулам для станаўлення зусім іншага светапогляду насельніцтва і актыўнага ўключэння яго ў самаадукацыйныя працэсы. Гэта стала мажлівымі дзякуючы ўдзелу насельніцтва ў грамадскіх аб’яднаннях і праз доступ да пазацэнзурнага друку, які пачынае шырока распаўсюджвацца на Беларусі ад 1988 года. У 1989 годзе на Беларусі пачынаюць выходзіць 35 выданняў і не толькі ў буйных гарадах, але і ў раённых цэнтрах, такіх як Ваўкавыск, Слонім, Іўе, Наваградак. Беларускія выданні пачынаюць друкавацца ў Беластоку (“Вера”, “Кантакт”), Рызе (“Голас беларуса”), Таліне (“Грунвальд”), Маскве (“Шляхам Скарыны”).

Год распачаўся з правядзення 1 студзеня ранішніку для дзяцей пахаднянцаў у памяшканні СШ №8. 5 студзеня ў палацы “Юнацтва” адзначаліся 70-я ўгодкі БССР і КПБ, дзе маглі выступіць ўсе ахвотныя ветэраны. Там жа 12 студзеня адбывалася і сустрэча з паэтамі – Юркам Голубам і Данутай Бічэль-Загнетавай, якія пазнаёмілі прысутных з сучаснай беларускай паэзіяй. Ад Гародні былі абраны 20 дэлегатаў на II Вальны Сойм беларускіх суполак у Вільню, якія адправіліся на прыгарадным цягніку Гродна-Вільня 14 студзеня па неіснуючай зараз чыгунцы. Да нашай дэлегацыі далучыліся сакратары гаркама камсамола, а таксама карэспандэнты Гродзенскага тэлебачання. Станцыя Парэчча тады адносілася да Літоўскай чыгункі і таму надпісы на будынку вакзала былі на літоўскай мове. Па патрабаванні пахаднянцаў іх у хуткім часе змянілі на беларускія. Падчас сойму ў прэзідыум верш “Сталіца”, які перадаў нам Алег Бембель:

Можа й добра,
   што Вільню забралі?
Бо каб нашай сталіцай
была –
У магілах бы Храмы ляжалі
На пагосце бетону і шкла.

Толькі і страціўшы свет
   не скарыцца
Мой народ як шляхотны
Кастусь…
Там нашчадкаў Скарыны
сталіца,
Дзе духоўна
   Жыве Беларусь!...

У той час, як астатнія дэлегаты адпачывалі, кіраўніцтва Сойму выпрацоўвала “Зварот ініцыятыўнай групы Канфедэрацыі беларускіх суполак да беларускай моладзі” на адным з хутароў пад Вільняй. 19 студзеня на паседжанні “Паходні” абмяркоўвалі вынікі Сойму, а гісторык Міхась Ткачоў распавёў прысутным пра архітэктуру Кіеўскай Русі ды пра сувязі полацкай і гарадзенскай архітэктурных школ у XII стагоддзі.

Набліжаўся час выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

М.Ткачоў быў вылучаны кандыдатам ад ВА “Азот” і Інстытута Біяхіміі АН БССР, у якім планаваў вылучыцца сакратар абкама партыі Уладзімір Сямёнаў. Яшчэ 6 студзеня “Гродненская правда” змясціла замоўлены артыкул Міхася Ткачова “Кто мы такие”, а ўжо 10 лютага ў дзень правядзення акруговага перадвыбарчага сходу “Гродненская правда” надрукавала артыкулы гісторыка В. Чарапіцы “Будем честными друг к другу” і “ветэрана” вайны і працы В. Агеева “Кто ж вы такие?” цалкам скіраваныя як супраць Ткачова, так і супраць “Паходні”. 16 лютага пасля абмеркавання артыкулаў у газету быў накіраваны ліст “О честности и “Паходне”, пад якім падпісаліся 66 пахаднянцаў, а 16 членаў камуністычнай партыі падпісалі зварот да першых сакратароў абласнога і гарадскога камітэтаў КПБ Л. Кляцкова і А. Алёшына, у якім звярнулі іх увагу на не зусім годныя паводзіны выкладчыкаў ГДУ імя Я.Купалы і ГМІ.

Вясна была звязана з агітацыяй за М.Ткачова на рынку, Савецкай вуліцы, Фартох, дзе дарэчы агітавалі і прадстаўнікі Сямёнава. Не абышлося і без непаразуменняў. Так, напрыклад, можна ўзгадаць выпадак, калі за ноч з зачыненага памяшкання ГДК зніклі ўсе агітацыйныя матэрыялы Ткачова. На працягу 1989 года ў памяшканні Дома палітасветы на вул. Леніна дзейнічаў гісторыка-культурны лекторый, праграма якога была распрацавана М. Ткачовым. Лекцыі карысталіся вялікай папулярнасцю і збіралі штотыдзень некалькі соцен слухачоў. Не стаялі ў баку і іншыя пахаднянцы. Так, аўтару даводзілася выступаць і на абласной камсамольскай канферэнцыі з ацэнкай антымоладзевай накіраванасці палітыкі “ветэранаў” і неабходнасці большай незалежнасці камсамола ад партыйнага ўплыву. Таксама прыкладна ў гэты самы час сябры “Паходні” звяртаюцца ў гарвыканкам з просьбай далучыць на назвы клуба “гісторыка-культурны” яшчэ і слова “палітычны”. З гэтага часу, як заўважыў Ткачоў, “на паседжанні да нас сталі хадзіць не адзін, як раней, а два інструктары райкамаў партыі – Кастрычніцкага і Ленінскага”. У друку на ўсіх узроўнях узніміліся пытанні адраджэння мовы і культуры, а на паседжаннях адбываліся агляд прэсы Прыбалтыкі і абмеркаванне дасягненняў і памылак суседніх “франтоў”, бо рух “Адраджэнне” тады толькі ўбіраўся ў моц.

На пачатку красавіка ў Гародні ладзіўся чарговы 3-ці Фестываль беларускай рок-музыкі “Рок-крок”, арганізатарамі якога былі і сябры клуба разам з маладзёжным цэнтрам пры гаркаме камсамола. Пахаднянцы запрасілі сваіх знаёмых з Беларускага аб’яднання студэнтаў у Польшчы, ад якіх з таго часу захаваўся аўтограф у пахаднянскім альбоме гасцей: “Бас чакае Вас! Дарагая Паходня,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

дзякуем за гасьціну і чакаем у Заходняй Беларусі. Дзяўчаты ды хлопцы з БАСа. Гародня .2.04.89 г. Юрка Каліна, Богдан Сіманенка, Яраслаў Зелянкевіч". 18 красавіка на Гарадзеншчыне адбылося спатканне з беларускімі пісьменнікамі з Польшчы, якія прыбылі ў складзе вялікай дэлегацыі. Вось што яны напісалі аб сустрэчы: "Зь вялікай прыемнасцю і хваляваннем сустрэліся мы з членамі "Паходні". Такі цёплы прыём забавязвае нас да далейшай ахвярнай працы на роднай беларускай ніве ў карысць нашай культуры. Варта пісаць, варта працаваць, калі ёсць такія верныя слухачы і чытачы. Сустракаемся мы першы раз, аднак думаем, што гэта не апошні. Дык да новых сустрэч, дарагія Сябры! Гародня. 18.IV.1989 году. Віктар Швед, Сакрат Яновіч".

26 красавіка на 3-ю гадавіну Чарнобыльскай аварыі ў Гародні адбыўся экалагічны мітынг. 25 мая ў Маскве пачаў працу З'езд народных дэпутатаў. Уладзімір Сямёнаў, які ўсё такі патрапіў на яго, выступіў з прапановай далучыць Віленскі край да Беларусі. Дзіўна: ён сказаў пра тое, аб чым пахаднянцы ніколі не гаварылі, але ў чым іх заўсёды абвінавачвалі… З'езд працягваўся два тыдні. 7 чэрвеня на пост кіраўніка ўраду СССР з прапановы Міхаіла Гарбачова быў прызначаны Міхаіл Рыжкоў, тады яшчэ зусім малады чалавек. Пяцігоднка 5 П ("пятилетка пышных похорон престарелого правительства") завяршылася. Крокі перабудовы былі адчувальныя і на Беларусі. Адбыліся рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Народ. Культура. Перабудова", І з'езд Беларускага экалагічнага саюзу, Устаноўчы з'езд Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны… На "Паходні" адбыліся дзве сустрэчы з артыстамі Абхаскага (22.06) і Закарпацкага (20.07) тэатраў. Не менш, чым у папярэднім годзе намі надавалася ўвагі падрыхтоўцы да Купалля. 10 пахаднянцаў рыхталіся да Купалля ў Супраслі, якое адбылося 24 чэрвеня, куды акрамя іх быў запрошаны танцавальны калектыў "Васілёк" з Амерыкі, створаны Алай Орса-Раманай, бацькі якой паходзілі з Наваградчыны.

Даволі прадстаўнічая дэлегацыя гарадзенцаў прымала ўдзел ва Ўстаноўчым з'езд БНФ "Адраджэньне" , які адбываўся 24 і 25.06.89 г. у Вільні. На з'ездзе прысутнічалі 433 дэлегаты, а разам з гасцямі і прэсай было больш за 1000 чалавек. На з'езд даслалі прывітальныя тэлеграмы народныя пісьменнікі Беларусі Пімен Панчанка і Янка Брыль, з трыбуны быў зачытаны ліст ад Васіля Быкава. У з'ездзе прынялі ўдзел і выступілі народныя дэпутаты СССР С. Шушкевіч, А. Жураўлёў, С. Габрусёў і іншыя знакамітыя асобы. У склад Сойму былі абраныя 55 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі суполак з Літвы, Латвіі,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Эстоніі, Масквы і Беласточчыны. У выніку двухдзённай працы былі ўхваленыя шэраг рэзалюцый: “Аб дзяржаўнасці беларускай мовы”, “Аб свабодзе сумлення і беларусізацыі рэлігійнага жыцця ў Беларусі”, зварот да народаў СССР і краін сябровак ААН з просьбай аб аказанні дапамогі Беларусі ў ліквідацыі вынікаў Чарнобыльскай аварыі. За некалькі дзён да гэтага – 22 чэрвеня адбыўся XIII пленум ЦК КПБ, які разгледзеў пытанне “Аб узмацненні ўплыву партыйных камітэтаў і арганізацый на грамадска-палітычную абстаноўку ў рэспубліцы на сучасным этапе перабудовы”. Аднак перашкодзіць стварэнню альтэрнатыўнай арганізацыі ён ужо не змог. Гарадзенцы абралі старшынёй сваёй суполкі БНФ “Адраджэнне” М. Таранду, які ўзначальваў суполку на працягу паўгода.

Другое Гарадзенскае Купалле адбылося вечарам 30 чэрвеня. У ім прынялі удзел каля 350 чалавек, у тым ліку і дэлегацыя студэнтаў з Польшчы. Нягледзячы на летняю пару грамадска–палітычнае жыццё вiравала. 26 ліпеня на тэрыторыі стадыёна ў Новым парку адбыўся мітынг БНФ, у якім ўдзельнічала каля 8 тысяч гарадзенцаў. У пачарговых выступах на працягу 3 гадзін прадстаўнікоў БНФ і ўладаў абмяркоўваліся пытанні экалогіі, адраджэння мовы і культуры. На наступны дзень адбылася сустрэча з ленінградскім гісторыкам Валянцінам Грыцкевічам, а 3 жніўня з паэткай Вольгай Іпатавай, якая пакінула наступны запіс:

“Усё, што ў Гродне лепшага сягоння –
Збіраецца вакол цябе, “Паходня”!”

Вечарам Мікола Сахарэвіч з Польшчы выступіў перад пахаднянцамі са сваімі песнямі пад гітару.

Па ўсёй краіне адбываліся спатканні з дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР, у рамках якіх 10 жніўня адбылася сустрэча з Валянцінай Кісялёвай. Была яшчэ магчымасць уплываць на падзеі праз абраных дэпутатаў, а таксама шляхам абмеркавання розных пытанняў. 17 жніўня адбылася дыскусія па моўным пытанні, 24 – абмяркоўвалі праект Закону аб выбарах у Вярхоўны Савет БССР. Штодня ладзілі пікеты, на якіх збіралі подпісы пад патрабаваннем надрукаваць альтэрнатыўны праект Закону аб выбарах. 28 жніўня абмяркоўвалі платформу КПСС па нацыянальным пытанні і свае дапаўненні ў праект, спаткаліся з кіраўніком беларускага эстраднага калектыву “Дубіны” з Польшчы Пятром Скепкам. Мы дамагліся, каб можна было свабодна падпісацца на тыднёвік беларусаў ў Польшчы “Ніву”, а таксама набываць яго праз “Саюздрук”. Напісалі ліст да Старшыні Камітэту па тэлевізіі і радыёвяшчанні Генадзю Бураўкіну с просьбай даць магчымасць беларусам Беласточчыны глядзець перадачы

беларускага тэлеканала, пад якім падпісаліся 96 чалавек.

Не менш насычанай выдалася восень 1989 г. 2 верасня пахаднянцы выйшлі на суботнік, які ладзіўся на плошчы Леніна, грошы ад якога ішлі на дапамогу чарнобыльцам. 11 верасня зноў адбылася сустрэча з Валянцінай Кісялёвай і намеснікам старшыні БНФ Міхасём Ткачовым, які да гэтага часу ўжо пакінуў Гародню і працаваў у рэдакцыі БСЭ. На вуліцах Гродна пачалі з'яўляцца шыльды на двух мовах, але пасля нашай сустрэчы і размовы са старшынёй гарвыканакама С. Андрэеўскім і першым сакратаром гаркама А. Алёшыным яны былі заменены на беларускамоўныя. Пахаднянцамі былі сабраны подпісы, дзякуючы якім ведамасная паліклініка №3 на вул. Астроўскага пастановай выканкама абласнога Савету народных дэпутатаў ад 31 жніўня была перададзена пад дзіцячую.

Разам з маладзёжным цэнтрам пры гаркаме камсамола 22 верасня быў арганізаваны канцэрт беларускага спевака са ЗША – Данчыка (Багдана Андрусішына), які выступаў разам з Лявонам Барткевічам і Сяржуком Сокалавым-Воюшам. Падчас прыезду Данчыка на радзіму сваёй маці кінарэжысёр Адольф Канеўскі зняў дакументальны фільм "Данчык", які трансліраваўся па ўсесаюзнай тэлевізіі. 25 верасня паседжанне "Паходні" ў сувязі з 50-мі ўгодкамі аб'ядняня Беларусі было прысвечана пакту Рыбентропа-Молатава, а таксама КПЗБ. У кастрычніку рыхтаваліся да святкавання "Дзядоў", якое адбылося 29 чысла таго ж месяцу. Ад гарадскога дома культуры калона рушыла на вайсковыя могілкі на вуліцы Белуша. Па шляху былі ўскладзены кветкі да помніка воінам, партызанам і падпольшчыкам у парку, а таксама да помнікаў Э. Ажэшкі, Я. Купалы, маці М. Багдановіча і іншых вядомых грамадскіх дзеячаў. На чарговым паседжанні 20 лістапада пахаднянцы абралі 52 прадстаўнікоў на Гродзенскую ўстаноўчую канферэнцыю ТБМ імя Ф. Скарыны.

1989 г., як і ўвесь той час, выдаўся надзвычай насычы на падзеі, сустрэчы і дзеянні. Гэта быў час шматлікіх допісаў і актыўнага ўдзелу грамадзян у развіцці краіны, якая рухалася да сваёй незалежнасці. І ў выніку гэтай працы мы зараз маем незалежную Рэспубліку Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ